«МОЙ МІЦЯ ПРЫВЫК ЖЫЦЬ У ЛЮБОВІ...»

«Суседзі спачатку цураліся сына, а цяпер жартуюць, што зробяць яго швейцарам...»

Гэтае пытанне мучыць і тысячы іншых людзей — бацькоў такіх жа дзяцей. Усе яны баяцца, што іх сын (ці дачка) рана ці позна трапіць у інтэрнат.

Уявіце сваё жыццё ў пакоі, дзе ад 4 да 6 чалавек, прычым у дарослым інтэрнаце побач могуць жыць малады мужчына з інваліднасцю, які трапіў туды, калі яму споўнілася 18 гадоў, дзядуля з дэменцыяй, алкаголік або наркаман з рознымі расстройствамі... І вы ніколі больш не спытаеце: а чым яму будзе дрэнна ў інтэрнаце? І нават калі там створаны ідэальныя ўмовы — усё роўна ў інтэрнаце вы жывяце з тым, з кім, магчыма, не хацелі б жыць, снедаеце тым, што не хацелі б есці, паднімаецеся ранкам тады, калі, можа, не хацелі б уставаць. Вы цалкам залежны чалавек, і вашага меркавання ніхто не пытаецца...

Месяц знаходжання дзіцяці ў доме-інтэрнаце абыходзіцца нашай дзяржаве ў 1018 рублёў. Кошт утрымання дарослага чалавека ў доме-інтэрнаце агульнага тыпу складае каля 767 рублёў, у псіханеўралагічным доме-інтэрнаце — каля 600 рублёў у месяц.

«Мой Міця прывык жыць у любові, — кажа Алена, яго маці. — У яго ёсць уласны пакой, свой гардэроб. Яго ведаюць усе суседзі, ён сам ходзіць у краму, ездзіць па горадзе з суправаджэннем. Мы з ім наведваем кафэ, удзельнічаем у розных спартыўных мерапрыемствах»...

Будзем шчырымі, калі вы ніколі не сутыкаліся з такімі людзьмі раней, першай вашай рэакцыяй будзе, скажам так, некаторая насцярожанасць... Але дастаткова крыху паназіраць за імі, паспрабаваць паразмаўляць — і ўсе апасенні, як правіла, развейваюцца, нібы раніш-ні туман над раллёй.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Майго сына ні разу не пакрыўдзіў ні адзін сусед, яму ніколі не сказалі дрэнната слова ў краме, — кажа Алена. — Чаму я гэта ведаю? Таму што ён бы спалохаўся і больш туды не пайшоў бы. Але я з суседзямі спачатку вельмі шмат размаўляла. Так, яны па першым часе цураліся майго Міці. Але я ім тлумачыла: мой сын не размаўляе, не чытае, не піша. Але ён усё разумее, яго завуць Міця... І ён вітаецца з усімі, заўсёды адкрые дзверы ў пад'ездзе, калі хто ідзе, выкліча ліфт... Суседзі жартуюць, што зробяць яго швейцарам».

У 1991 годзе, калі нарадзіўся Міця, Алене прапанавалі здаць яго ў інтэрнат. Тады было так: альбо мама здае дзіця, якое нарадзілася з цяжкімі парушэннямі, туды, альбо сядзіць з ім дома, паставіўшы на сваім жыцці крыж. Алену не задаволіў ні адзін з гэтых варыянтаў. Міцю наогул пашанцавала, таму што яго мама аказалася не проста любячай і самаадданай, але і з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

Цяпер яна, мабыць, адна з самых вядомых асоб сярод такіх жа бацькоў, а таксама прафесіяналаў, што займаюцца згаданай праблемай, і актывістаў грамадскіх арганізацый. Алена Цітова стаяла ля вытокаў і ўжо шмат гадоў з'яўляецца старшынёй «Беларускай асацыяцыі дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам» («БелАДДІіМІ») — грамадскай арганізацыі, што аб'ядноўвае каля 3000 сем'яў, у якіх жывуць дзеці і маладыя людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

«Мы першымі ў краіне стварылі цэнтр для дзяцей-інвалідаў, якія лічыліся ненавучаемымі. Паралельна лабіравалі адкрыццё аналагічных па ўсёй рэспубліцы, а пачынаючы з 2000-х Цэнтры карэкцыйна-развівальнага навучання (ЦКРН) адкрыліся па ўсёй краіне, — расказвае Алена Цітова. — Пры іх адкрыліся класы, дзе маглі займацца дзеці з самымі цяжкімі парушэннямі. Зараз ужо ёсць і інтэграваныя групы. І ў аддзяленнях дзённага знаходжання дарослыя інваліды (1—2 групы, як правіла, з разумовымі абмежаваннямі) не сядзяць невылазна ў чатырох сценах»...

Дом-інтэрнат — ужо не адзінае выйсце

Вядома, людзі з разумовымі абмежаваннямі да канца жыцця маюць патрэбу ў суправаджэнні. Хоць бы таму, што нават з лёгкай ступенню абмежаванняў яны — патэнцыйныя ахвяры самых разнастайных ашуканцаў. Дамы-інтэрнаты і ўзніклі калісьці з мэтай абараніць такіх людзей. Тым не менш ужо 50—60 гадоў назад у Еўропе вялікія дамы-інтэрнаты сталі зачыняцца. Вядома, сваю ролю тут адыгралі гуманныя меркаванні, але ўсё ж на першым месцы стаялі эканамічныя прычыны.

Утрымліваць чалавека ў інтэрнаце — гэта заўсёды дорага. Так, паводле звестак Міністэрства працы і сацабароны, месяц знаходжання дзіцяці ў доме-інтэрнаце абыходзіцца нашай дзяржаве ў 1018 рублёў. Кошт утрымання дарослага чалавека ў доме-інтэрнаце агульнага тыпу складае каля 767 рублёў, у псіханеўралагічным доме-інтэрнаце — каля 600 рублёў у месяц. Калі такі чалавек жыве ў сям'і, то дапамога па доглядзе інваліда першай групы (пры гэтым чалавек, які яго даглядае, не мае права працаваць) і пенсія па інваліднасці складаюць, па словах Алены Цітовай, у суме каля 443 рублёў. Пагадзіцеся, розніца ёсць.

Гэта ўжо разумее і дзяржава. З 2013 года ў нас у краіне з'явілася такое паняцце, як «суправаджальнае пражыванне інвалідаў». А ў апошнія гады пры ТЦСАН сталі адкрывацца аддзяленні суправаджальнага пражывання.

«Цяпер, напрыклад, пажылая мама-пенсіянерка, якой ужо цяжка самой даглядаць такога сына, можа патэлефанаваць туды і сказаць: мне складана завесці яго ў паліклініку або прыгатаваць для яго абед... Заключаецца дагавор, і сацработнік будзе ажыццяўляць элементы таго догляду, які раней ажыццяўлялі бацькі, — кажа Алена Цітова. — Я лічу, што гэта самы лепшы шлях. Людзі з інваліднасцю застаюцца ў звыклым асяроддзі, дзе іх усе ведаюць. Калі вяртацца да майго сына... Дапусцім, нас з мужам не стане. Тады сацработнік дапаможа арганізаваць яму побыт».

У цэнтры — Міця ЦІТОЎ.

Фота Алены ЦІТОВАЙ.

Наступным крокам, які, на думку Алены Цітовай, зробіць гэтую дапамогу больш таннай, стане аб'яднанне 5—7 такіх чалавек у адной вялікай кватэры. Людзі рознага ўзроўню інтэлектуальных парушэнняў змогуць жыць разам у суправаджэнні сацработніка і дапамагаць адзін аднаму.

* * *

— Скажыце, ці не будуць пры гэтым у нейкай ступені ўшчэмленыя правы іншых, каму, можа быць, будзе некамфортна жыць па суседстве з такой кватэрай? — задаю пытанне Алене Цітовай.

— У Германіі, напрыклад, калі дзесьці адкрывалася такая кватэра ці будаваўся дом, у першую чаргу расказвалі суседзям, якія і з якімі парушэннямі людзі будуць там пражываць. І што яны — не небяспечныя, не заразныя і г. д. Больш за тое, ім даваўся тэлефон арганізацыі, якая суправаджае пражыванне такіх людзей, і прасілі ў любой хвалюючай сітуацыі тэлефанаваць. Дарэчы, такое інфармаванне праводзілася яшчэ і з мэтай знайсці добраахвотных памочнікаў сярод суседзяў.

Наогул, суседзі — гэта самая галоўная сіла пры суправаджальным пражыванні. І замежны вопыт, і вопыт нашай арганізацыі паказвае, што калі ўсё растлумачыць, то яны не толькі не супраць такога пражывання, але і імкнуцца дапамагчы гэтым людзям.

* * *

«Бацькам асаблівых дзяцей вельмі важна прывучыць іх да як мага большай самастойнасці. Так, іх дзеці, нават стаўшы дарослымі, заўсёды будуць мець патрэбу ў суправаджэнні. Пытанне — наколькі яно будзе вялікае», — лічыць Алена Цітова.

Гэта ж датычыцца і выпускнікоў дзіцячых дамоў-інтэрнатаў. Цяпер пры іх ствараюцца аддзяленні суправаджальнага пражывання, дзе выхаванцаў рыхтуюць да самастойнага жыцця. А зусім нядаўна ў Полацку пры мясцовым ТЦСАН дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Свет без межаў» адкрыла інтэрнат для выпускнікоў дзіцячага дома-інтэрната. Пражываць там хлопцы і дзяўчаты будуць на працягу паўгода, пакуль не вырашаць пытанні з атрыманнем сацыяльнага жылля. Адначасова яны будуць навучацца прафесіі або працаваць, самастойна весці гаспадарку і адаптавацца да нармальнага жыцця.

А яшчэ ў канцы снежня мінулага года ў Беларусі ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», у якой прадугледжана і такая форма сацыяльнага абслугоўвання, як замяшчальная сям'я. Прыёмным членам такой сям'і можа стаць як пажылы чалавек старэйшы за 70 гадоў, так і адзінокі чалавек з інваліднасцю I або II групы, з улікам медыцынскіх паказанняў і супрацьпаказанняў.

І хоць мы робім толькі першыя крокі ў гэтым кірунку, але альтэрнатыва інтэрнату ўжо ёсць.

Святлана БУСЬКО.

❍ Афіцыйна

ПРАДСТАЎНІКІ МІНПРАЦЫ І САЦАБАРОНЫ: ВАРЫЯНТЫ ЁСЦЬ

Намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мінпрацы і сацабароны Таццяна ФЁДАРАВА:

— У выпадку, калі ў сям'і выхоўваўся інвалід з дзяцінства, які стаў дарослым, а яго бацькі памерлі, ёсць тры варыянты далейшага развіцця падзей.

Першы варыянт. У выпадку цяжкага дыягназу і немагчымасці жыць самастойна чалавека з інваліднасцю могуць пазбавіць дзеяздольнасці ў судовым парадку. У такім выпадку яму павінен быць прызначаны апякун. Ініцыююць гэты працэс звычайна члены сям'і або хто-небудзь з сваякоў. Апякун з'яўляецца законным прадстаўніком інваліда, ён арганізуе яму жыццё, прымае за яго рашэнні, абавязаны абараняць яго правы. Чалавек пры гэтым застаецца жыць дома і ў дапамозе сацыяльнай службы не мае патрэбы.

Другі варыянт. Чалавека з інваліднасцю пазбавілі дзеяздольнасці, у яго ёсць апякун і дадаткова аказваюцца паслугі тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Ён можа наведваць аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў, яму могуць аказвацца паслугі суправаджальнага пражывання... Але ўсё гэта пры ўмове, што маецца хтосьці, хто нясе за яго адказнасць: плануе яго фінансы, аплачвае камунальныя плацяжы і г. д.

У гэтым выпадку апякун будзе арганізоўваць самастойнае пражыванне інваліда, а ТЦСАН аказваць паслугі суправаджальнага пражывання, гэта значыць дапаможа арганізаваць побыт такога чалавека. Тэрытарыяльны цэнтр арганізуе для яго паслугі асістэнта, якія прызначаны для адзінокіх і адзінока пражываючых інвалідаў I і II групы з разумовымі парушэннямі. Заключэнне аб тым, што чалавек мае патрэбу ў той ці іншай паслузе, даюць медыкі. Паслугі асістэнта аказваюцца бясплатна, але не больш як 60 гадзін у месяц, у адпаведнасці з індывідуальнай праграмай рэабілітацыі інваліда або заключэннем УКК.

Акрамя таго, ТЦСАН можа даць памочніка інвалідам I групы з парушэннямі апорна-рухальнага апарату і інвалідам па зроку, а таксама перакладчыка мовы жэстаў інвалідам з парушэннямі слыху.

Трэці варыянт. Калі не знайшлося нікога, хто захацеў бы апекаваць чалавека з інваліднасцю, орган апекі і папячыцельства можа выступіць з хадайніцтвам аб тым, каб накіраваць яго ў дзяржаўную ўстанову. Вось у такім выпадку чалавек з інваліднасцю і аказваецца ў псіханеўралагічным доме-інтэрнаце. Апекуном пры гэтым прызначаецца дырэктар дома-інтэрната.

Вядома, самым аптымальным варыянтам магло б стаць увядзенне інстытута персанальнага асістэнта інваліда, як у Еўропе. Гэта комплексна вырашыла б згаданую праблему. Магчыма, мы прыйдзем да гэтага. Работа па карэкцыі законаў, якія датычацца людзей з інваліднасцю, вядзецца пастаянна.

Намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі сацабслугоўвання галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Мікалай АРОЛ:

— Што датычыцца дзяцей, якія пражываюць у дзіцячых дамах-інтэрнатах, то ў 9 з 10 такіх устаноў ужо створаны моладзёжныя аддзяленні, гэта значыць, дасягнуўшы паўналецця, пастаяльцы не пераходзяць у дарослы дом-інтэрнат, а застаюцца жыць у звыклых умовах. І ва ўсіх дзіцячых дамах-інтэрнатах зараз створаны аддзяленні суправаджальнага пражывання — для тых маладых людзей, хто, па заключэнні медыкаў, пасля адаптацыі зможа жыць самастойна. Для іх ствараюцца ўмовы, максімальна набліжаныя да самастойнага жыцця: яны жывуць у асобных пакоях, самі сабе гатуюць ежу, прыбіраюць у пакоях і г. д. Падрыхтоўка да асобнага пражывання праходзіць паэтапна. На апошнім этапе маладых людзей вывозяць з дома-інтэрната, ствараюць розныя сацыяльныя сітуацыі і вучаць, як сябе паводзіць па-за межамі ўстановы (у банку, магазіне, тэатры і г. д.).

Такім чынам ужо выйшлі з інтэрнатаў і жывуць самастойна каля 100 чалавек. Тут павінны падключыцца і мясцовыя органы, выдзяляць працоўныя месцы і жыллоплошчу (інтэрнат або спецыяльны дом), і грамадскія арганізацыі. А ў многіх жыллё зараз, калі школьнікі шмат часу праводзяць каля маніторaў камп'ютараў і бавяць час са смартфонамі.

На працягу двух мінулых гадоў праект пад назвай «Я бачу» праводзіўся ў асобных раёнах Гомельскай і Магілёўскай абласцей. Па выніках агляду ў 31 % дзяцей былі выяўлены розныя паталогіі зроку. У паловы з іх захворванні дыягнаставаны ўпершыню. Малыя пацыенты атрымалі рэкамендацыі, рэцэпты на акуляры, некаторых жа накіравалі на лячэнне ў стацыянары, а 80 чалавек адправіліся на аперацыю, паведаміла **прадстаўнік прэс-службы кампаніі velcom Лізавета ШАЛАЙ**. І вядома ж, чым раней пачнецца лячэнне, тым лепей для пацыента. На гэта і накіраваны дабрачынны праект.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ На слыху

ЯК САБАКА Ў ЗГРАІ

Час ад часу адчуваю сябе сабакам са зграі прафесара Паўлава. Сліна выдзяляецца, першая сігнальная сістэма патрабуе кідаць усё, калі ежы яшчэ няма, але нехта пра яе ўжо зычна гаворыць. І самой прыходзіцца зарабляць харчаванне тэрміновай рэакцыяй на штосьці, што праляцела са свістам і грукатам у паветры. Прабачце, у інтэрнэце.

Вось чарговая сенсацыя. Адзін гамяльчанін з-пад крыса ў гарадскім аўтобусе зняў сварку паміж школьніцай і кантралёрам. І, адчуўшы сябе неверагодна смелым барацьбітом за справядлівасць, выклаў гэта тэлефоннае відэа ў супольнасці «Гэта Гомель, дзетка!».

І панеслася. Шматлікія каментарыі пра жорсткасць паводзінаў кандуктаркі, пра справядлівасць і, канешне, абагульненні наконт жудасных адносін паміж людзьмі.

Звычайная сварка, дарэчы, без нецэнзурнай лексікі і зневажання прыпыніла звычайную работу многіх, хто адказвае за рух транспарту ў Гомельскай вобласці. Затое сенсацыйнае відэа за дзень сабрала «лайкі» ў такой колькасці, што ўвесь наступны месяц яго аўтар можа выхваляцца перад суседзямі і сваякамі. 134 тысячы праглядаў за адзін толькі вечар! Пакуль нехта з аналагічным супер-сюжэтам не нераб'е яго славу, завяваную цяжкай працай.

Між тым, калі эмоцыі закінуць на гарышча і паглядзець тое самае відэа спакойна, можа здацца, што каментатары пішуць зусім не пра тое, што бачаць сваімі вачыма. Ці ўвогуле не бачаць, але пішуць, бо абавязкова ж быць у зграі.

Самае большае, на што можа прэтэндаваць аўтобусны канфлікт, дык на загаловак «як бабкі на базары». Дзяжурная лаянка паміж пасажырамі і жанчынай у форме кандуктара. Дарэчы, зафіксаванае цягнецца роўна паўтары хвіліны. Затым кандуктар ідзе далей выконваць сваю работу.

Падаецца ж усё вось так: «Кандуктар папрасіла ў школьніцы аплату праезду. Тая прад'явіла ёй даведку. У выніку кандуктар проста ў аўтобусе правяла экспертызу і заявіла, што даведка пратэрмінаваная, выходзячы з таго, што на даведцы лічба 2018 вельмі падобная на 2016. А яшчэ ў дзяўчынкі на фота касічкі, а ў гэтай школьніцы валасы распушчаны. Дзяўчынка аплаціла праезд без якіх-небудзь пытанняў, пасля чаго кандуктар вырвала з рук дзяўчынкі даведку. Калі за дзяўчынку пачалі ўступацца ўсе пасажыры, кандуктар пачала крычаць на школьніцу.

У выніку дзяўчынка ў слязах, кандуктар пад ціскам пасажыраў адарвала фатаграфію і аддала яе дзяўчынцы. Ці правамерныя ўсе гэтыя дзеянні на ваш погляд? На якой падставе кандуктар выкрала даведку, сапсавала яе і накрычала на дзіця?»

Старшы выкладчык кафедры філасофіі, гісторыі, паліталогіі БелДУТа, псіхолаг Таццяна САСНОЎСКАЯ адзначае, што цяпер у сеціве вельмі многа відэасюжэтаў, калі людзі здымаюць нейкія няправільныя з іх пункту гледжання паводзіны іншых:

— Між тым, калі чалавек здымае, ён ужо з'яўляецца ўдзельнікам гэтай падзеі. Сёння ж усе баязліва робяць здымкі здалёк і з-пад крыса, выкладаюць у сеціва і пацяшаюцца з канфлікту. Калі мы бачым, што нехта некага зневажае, лаецца ці нават б'е, мы не спрабуем самі змяніць сітуацыю дзеяннем — мы пачынаем яе здымаць. Падаём свой удзел быццам грамадзянскую пазіцыю, але насамрэч гэта пазіцыя — «мая хата з краю, я нічога не ведаю». Гэта танная папулярнасць, а не сапраўдная грамадзянская пазіцыя. Кандуктар выконвала свае абавязкі. Іншая справа, што зрабіла гэта не зусім у карэктнай форме. Людзі ў аўтобусе і каментатары хацелі б, каб да школьніцы аднесліся нефармальна, а не па законе. Але ж з самога кандуктара будуць пытаць фармальна. Калі б яна не праверыла даведку — яе б пакаралі. Патрабаванні ў нас адны, а жаданні — іншыя. Такая двайная мараль атрымліваецца: мы самі не хочам выконваць закон, але патрабуем, каб з намі паступалі па законе. Заўважце, кантралёр дзяўчынку не высаджвала з транспарту. Школьніца сама аддала 50 капеек за праезд і канфлікт мог быць вычарпаны на гэтым.

Між тым на прадпрыемстве ААТ «Гомельаблаўтатранс» да разбору палётаў па роліку ў інтэрнэце падышлі грунтоўна. **Намеснік генеральнага дырэктара па ідэалагічнай рабоце і кадрах Алег ЦЫЛЬКО** гаворыць, што сітуацыю паглядзелі не толькі на скандальным відэа:

— Высветлілася, што даведка, якую прад'явіла ў аўтобусе школьніца, сапраўды была падробленая. У паперы 2016 год выпраўлены на 2017. Лічба «6» — на «7». Кандуктар, якая дагэтуль не мела ніякіх нараканняў па рабоце, нічога ў гэтым выпадку не парушыла. Яна выконвала свае службовыя абавязкі. Між тым у выпадку, калі супрацоўнік бачыць, што прад'яўлены дакумент выклікае сумненні, ён можа забраць гэты дакумент. Да таго ж, у адпаведнасці з адміністрацыйным кодэксам, за падробку дакумента дзяўчынку ці яе бацькоў маглі б прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці і даць штраф да 10 базавых велічынь. Кіраўніцтва аўтапарка звязалася са школай, з дзяўчынкай пагутарылі. Яна сказала: ведала, што даведка падробленая. Прэтэнзій у яе да кандуктара няма. І ўсё ж з кандуктарам мы правялі гутарку. Яна адзначыла, што эмоцыі ў той момант узялі верх і цяпер яна асэнсавала сітуацыю. Разглядаецца пытанне пра прыцягненне кандуктара да адказнасці за нетактоўныя паводзіны.

Дарэчы, калі зусім дакладна выконваць усе правілы, растлумачылі ў «Гомельаблаўтатрансе», у гэтай сітуацыі трэба было б выклікаць міліцыю. Згодна з інструкцыяй, кантралёр павінна была прасіць кіроўцу аўтобуса заблакаваць усе дзверы, калі транспарт пад'ехаў да прыпынку. Усе яго пасажыры заставаліся б у машыне, пакуль не прыехалі б праваахоўнікі для разбору з непаўналетняй школьніцай. Таму, калі наступным разам вы спозніцеся на работу з-за грамадзяніна з падробленай паперай, не здзіўляйцеся. Закон для ўсіх адзіны.

Увогуле ж, з любога дробнага канфлікту можна зрабіць сенсацыйную навіну. Калі ёсць пэўны намер. Але ж з пункту гледжання будаўніцтва стабільнага прававога грамадства такія выпадкі накіраваны выключна на яго разбурэнне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■ Майце на ўвазе

КАЛІ ІСЦІ ПА ПЕНСІЮ?

Выплачваць пенсіі і дапамогі за 17 красавіка на Белпошце будуць наступным чынам. З учарашняга дня пачалі выдаваць грошы ў сталічных аддзяленнях сувязі, з сённяшняга — ва ўсіх аддзяленнях Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей, у сельскіх паштовых аб'ектах Гомельшчыны і Гродзеншчыны. 16 красавіка пенсіі і дапамогі будуць выплачваць у гарадскіх аддзяленнях Гомельскай і Гродзенскай абласцей і ў Віцебску.

17 красавіка працаваць будуць толькі дзяжурныя аддзяленні сувязі. Падрабязней пра рэжым работы Белпошты можна даведацца па нумары 154.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

■ Праект

КАБ ДЗЕЦІ ДОБРА БАЧЫЛІ

У Брэсцкай вобласці стартаваў дабрачынны праект па дыягностыцы і аказанні афтальмалагічнай дапамогі дзецям з сельскай мясцовасці. Добрую справу робяць Беларускі дзіцячы фонд, кампанія velcom пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя і Брэсцкага аблвыканкама.

Ажыццяўленне праекта на Брэстчыне пачалося з наведвання школ Камянецкага раёна. Туды накіравалася брыгада ўрачоў-афтальмолагаў на спецыяльным аўтамабілі, які абсталяваны прыборамі для дыягностыкі паталогій органаў зроку. Яшчэ адна брыгада працуе ў Маларыцкім раёне. Пазней урачы выедуць у Кобрынскі, Жабінкаўскі, Пружанскі, Бярозаўскі, Ляхавіцкі і Ганцавіцкі раёны, дзе аглядзяць больш за 13 тысяч вясковых дзяцей. Як паказвае практыка, гэта вельмі патрэбна

■ Не проста педагог

ПРАФСАЮЗ РАЗБУРАЕ СТЭРЭАТЫПЫ!

Знаёмцеся: Іван ЯКІМЕНКА — настаўнік матэматыкі і інфарматыкі Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна, суперфіналіст Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года — 2011», уладальнік звання «Выдатнік адукацыі», настаўнік-метадыст, член клуба «Хрустальны журавель» і Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў Рэспублікі Беларусь «Імкненне», дэлегат з'ездаў настаўнікаў СНД.

Нядаўна да ўсіх сваіх шматлікіх рэгалій і званняў ён дадаў яшчэ адно — стаў пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Беларускі майстар — 2018».

Конкурс праводзіўся ЦК Беларускага прафсюза работнікаў адукацыі і навукі сумесна з Міністэрствам адукацыі і быў нацэлены на выяўленне ініцыятыўных, энергічных і мэтанакіраваных педагогаў — лідараў прафсаюзнага руху. У фінале сустрэліся па адным прадстаўніку ад кожнага рэгіёна. Прычым і педагагічны, і прафсаюзны стаж у фіналістаў аказаўся вельмі розны. Так, напрыклад, у настаўніцы пачатковых класаў з Кіселявецкага дзіцячага сада—сярэдняй школы Святланы Гардзіюк за плячыма 32 гады педагагічнай работы і 18 гадоў прафсаюзнага стажу. А ў Крысціны Маркавец, таксама настаўніцы пачатковых класаў, якая ўзначальвае прафкам сталічнай сярэдняй школы № 56, усяго пяць гадоў педагагічнага стажу і менш за тры гады прафсаюзнай актыўнасці. Тым не менш і запалу, і напору дзяўчыне не пазычаць. «Хто сказаў, што два плюс два будзе чатыры? Два плюс два будзе пяць! Прафсаюз разбурае стэрэатыпы!» — смела заявіла яна.

Фінал конкурсу ўключаў у сябе тры этапы: візітоўку «Педагог — старшыня прафкама гучыць горда!», фрагмент прафсаюзнага мініўрока і публічнае выступленне на тэму «Прафкам учора, сёння, заўтра». Журы брала пад увагу творчы характар асобы канкурсанта, выразнасць, лаканічнасць і лагічнасць выкладзенай ім інфармацыі, яе актуальнасць і сацыяльную важнасць. Абсалютна ўсе фіналісты паспрабавалі разбурыць стэрэатып пра работу прафкама як выключна культурна-забаўляльнага сектара. Калектыўны дагавор, працоўныя кантракты, сістэма матэрыяльнага заахвочвання, аказанне матэрыяльнай дапамогі, парушэнні правоў і інтарэсаў педагогаў, выдзяленне пуцёвак на аздараўленне, клопат за захаваннем бяспечных умоў працы — вось далёка не поўны пералік пытанняў, якія знаходзяцца ў поле зроку прафсаюза штодня. Ці шмат знаходзіцца ахвотных узваліць на сябе такі цяжар работы?

Іван Якіменка, нягледзячы на ўсю сваю занятасць па-за школай, класнае кіраўніцтва, пастаянныя майстар-класы і ўдзел у педагагічных дэсантах, вось ужо сем гадоў узначальвае школьны прафкам. «Як я трапіў у прафсюю? Мяне нарадзілі і выхавалі настаўнікі, у мяне ёсць старэйшы брат і сястра, усе мы закончылі адзін фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педінстытута. Выбіраць прафесію мне не давялося, але я знайшоў у ёй шмат новых граняў, — кажа ён сам пра сябе. — Я люблю, калі ўсё вызначана, але могуць здарыцца прыемныя нечаканасці. Ведаю, што ўсё будзе добра, нягледзячы ні на што. Лічу, што сапраўднага прафсаюзнага лідара вылучае аптымізм».

Усім удзельнікам яшчэ напярэдадні конкурсу было прапанавана вылучыць галоўнае ў іх прафсаюзнай рабоце. Будучы пераможца канстатаваў, што для яго галоўнае — вырашаць усе пытанні, што ўзнікаюць у калектыве, па справядлівасці. А іншым канкурсантам ён пажадаў «не сумаваць, шукаць, гарэць, разбегчыся і ўзлятець». У Івана Якіменкі гэта атрымалася, як мы ўжо ведаем, найлепшым чынам!

Надзея НІКАЛАЕВА